Андрэй Вашкевіч
(Гродна)

Грошы для партыі. Фінансаванне партыйнай дзейнасці Беларускай хрысціянскай дэмакратыі (1921-1939 гг.).

Пытанне аб фінансаванні дзейнасці палітычных партый, што ў розныя часы функцыянавалі на тэрыторыі Беларусі, да сённяшняга дня не атрымала належнай увагі з боку айчынных гісторыкаў. Такое становішча трэба прызнаць незадавальняючым, паколькі менавіта крыніцы фінансавання ў вельмі значнай ступені абумоўлівалі як ідэалогію гэтых палітычных партый, так і іх канкрэтную практычную дзейнасць. Савецкія беларускія гісторыкі, прысвячаючы найбольш увагі гісторыі КП(б)Б, пісалі аб палітычных партыях нацыянальнай скіраванасці выключна адмоўна, нават у пасляваенны час, паўтараючы газетныя штампы, што паходзілі яшчэ з 1930-гг. Гэта тычыцца і адной з найбольш значных беларускіх партый міжваеннага перыяду — Беларускай хрысціянскай дэмакратыі (БХД).

Прапагандысцка-ідэалагічная ўстаноўка аб шырокіх сувязях лідэраў БХД з польскай адміністрацыяй, разведкай і, адпаведна, згодніцкім характары самой партыі склалася ў канцы 1920-х — 1930-х гг. Менавіта БХД на працягу 1930-х гг. была напэўна адзінай беларускай партыяй, якая высоўвала ў якасці галоўнага пастулата дасягненне поўнай незалежнасці Беларусі і адначасова мела даволі шмат прыхільнікаў на тэрыторыі Заходняй Беларусі. Безумоўна, кампраметацыя БХД як незалежніцкай партыі ў гэты час станавілася прынцыповай задачай савецкіх спецслужбаў і ідэалагічных структур Савецкай Беларусі.

Ці не найбольшае значэнне ў гэтых абвінавачваннях мелі сцвярджэнні аб фінансавай залежнасці БХД ад польскіх дзяржаўных органаў. Напрыклад, аўтары надрукаванай у 1935 годзе Акадэміяй навук БССР працы „Политические партии в Польше, Западной Белоруссии и Западной Украине”, прызнаючы пэўныя ўплывы БХД сярод насельніцтва Заходняй Беларусі, падкрэслівалі факт шчыльнага супрацоўніцтва беларускіх хадэкаў і польскай адміністрацыі на Крэсах: „Польское фашист-

ское правительство предпочитает поддерживать БХД, которая имеет в массах большее влияние, чем какая-либо другая политическая организация белорусской буржуазии"[1].

У 1934 г. на тэрыторыі БССР была надрукавана брашура Алеся Гарадоцкага пад назвай „Як Беларуская Хадэцыя гандлюе крывёю рабочых і сялян"[2]. Напісана была яна на аснове паказанняў вывезенага савецкімі спецслужбамі ў Мінск з Усходняй Прусіі былога функцыянера БХД Паўлы Карузы. У брашуры хадэкі і дзеячы Беларускага сялянскага саюза (у прыватнасці кс. Адам Станкевіч і Фабіян Ярэміч) абвінавачваліся ў сувязях з кіраўніком віленскай дэфензівы Кіртыклісам, напрыклад, што атрымалі ад яго 74 тыс. злотых на правядзенне выбарчай кампаніі 1928 года[3]. Праз многа гадоў П. Каруза прызнаваў, што даведзены да знямогі бяссонніцай (яму не давалі спаць) напісаў гэтыя „паказанні" пад дыктоўку мінскага следчага Оберфельда[4].

Яшчэ праз тры гады з'явілася інфармацыя аб агромністай суме, якую польская разведка прапаноўвала беларусам і да атрымання якой з беларускага боку меў дачыненне кс. Адам Станкевіч — 15 мільёнаў долараў. Такую суму назваў у сваіх паказаннях Вацлаў Ластоўскі. Ён засведчыў, што яшчэ ў сярэдзіне 1920-х гг. сустракаўся са сваяком Юзэфа Пілсудскага, Заянчкоўскім, і той прапанаваў Ластоўскаму стварыць невялікі камітэт з 3-5 чалавек, які мог бы распараджацца гэтымі грашыма для арганізацыі беларускага антысавецкага руху. Ластоўскі ўключыў у гэты камітэт апроч сябе Клаўдзія Душэўскага і кс. Адама Станкевіча. Апошні быў спецыяльна выкліканы з Вільні ў Коўна[5]. Паказанні гэтыя, што несумненна таксама пісаліся пад дыктоўку следчага, хутчэй за ўсё павінны былі быць выкарыстаны для кампраметацыі Душэўскага і Станкевіча, якія ў канцы 1930-х гадоў актыўна дзейнічалі за межамі СССР і былі недасягальныя для НКУС. Праўда, у адрозненні ад папярэдняй, ні ў якім афіцыйным выданні гэтая фантастычная сума так ніколі і не была агучана.

Вышэйпрыведзеныя факты ніколі не паўтараліся нават савецкімі беларускімі гісторыкамі ў пасляваенныя гады. Сёння ж іх можна абвергнуць дакументальна. У матэрыялах дэфензівы лідэры беларускай ха-

[1] В. Кузнецова, *Белорусская христианская демократия*, [в:] *Политические партии в Польше, Западной Белоруссии и Западной Украине*, под ред. С. Скульского, Минск 1935, с. 289.

[2] „Беларуская Крыніца", 1934, № 29, с. 2.

[3] Звесткі ўзяты з: В. Кузнецова, *Белорусская христианская демократия*, с. 274-275.

[4] В. Новік, *Лёс музыканта*, „Полацак" (Кліўленд), 1991, № 4, с. 22-23.

[5] *Протокол допроса В. Ластовского от 7 октября 1937 г.*, „Маладосць", 1993, № 9, с. 234-235.

дэцыі праходзяць як перакананыя прыхільнікі незалежнасці Беларусі. Ксёндз Вінцэнт Гадлеўскі характарызуецца як асоба „папулярная сярод беларусаў (...) вядомая сваёй антыўрадавай дзейнасцю”[6], а кс. Адам Станкевіч — як актыўны працаўнік, які „стаіць на пазіцыі незалежнасці Беларусі ў яе этнаграфічных межах” і варожа ставіцца да польскай дзяржаўнасці[7]. Што ж тычыцца агромністых сум, якія дэфензіва быццам бы перадавала БХД на арганізацыю выбараў, то, паводле матэрыялаў самой дэфензівы, БХД прыступала да выбараў, „маючы абсалютна пустую партыйную касу”[8]. Дзяржаўныя структуры Польшчы на працягу 1921-1939 гг. ніколі не фінансавалі не тое што палітычнай, але нават культурнай і асветніцкай дзейнасці БХД. Так, калі ў 1931 г. пасол Сейма Ф. Ярэміч выступіў у бюджэтнай камісіі Сейма з прапановай выдзеліць для беларускай школы ў Рудаўцы на Слонімшчыне, якая ўтрымоўвалася Беларускім інстытутам гаспадаркі і культуры (БІГіК), суму ў 300-400 злотых, то атрымаў катэгарычную адмову[9]. Тое самае тычыцца і дапамогі з боку Касцёла (прынамсі пасля 1926 г., калі віленскім арцыбіскупам стаў Рамуальд Ялбжыкоўскі). За ўвесь перыяд 1926-1939 гг. біскупская курыя аказала беларускім хадэкам дапамогу ў выданні толькі адной кніжкі — „Кароткага катэхізма для беларусаў-каталікоў” ксяндза Язэпа Рэшаця[10].

Сучасныя беларускія гісторыкі выказалі некалькі версій аб магчымых крыніцах фінансавання БХД, не прысвячаючы, аднак, гэтаму пытанню асобных даследаванняў. Так даследчык Юрый Туронак высунуў меркаванне аб тым, што на працягу 1920-1930-х гг. асноўнай крыніцай грашовых паступленняў для партыі былі даходы ад гаспадаркі манастыра ордэна марыянаў у мястэчку Друя, створанага ў 1923 годзе пры падтрымцы тагачаснага віленскага арцыбіскупа Юрыя Матулевіча і княгіні Магдаліны Радзівіл[11]. Гэты тэзіс паўтараецца ў адным з артыкулаў гродзенскага гісторыка Івана Коўкеля. Апошні таксама, праўда, не даючы канкрэтных спасылак, піша аб тым, што кіраўнікі БХД „падтрымлівалі тэрытарыяльныя прэтэнзіі Літвы на землі Віленшчы-

[6] Archiwum Akt Nowych w Warszawie (далей: AAN), Ministerstwo Wyznań Religijnych i Oświecenia Publicznego (далей: MWRiOP) 1917-1939, sygn. 927, k. 208-209.

[7] *Галасы з далёкага мінулага (штрыхі да партрэту кс. Адама Станкевіча)*, „Куфэрак Віленшчыны”, 2005, № 1 (10), с. 118-119.

[8] Centralne Archiwum Wojskowe w Warszawie (далей: CAW), Oddział II Sztabu Generalnego, sygn. I.303.4.2706, k. 20.

[9] Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь (далей: НА РБ), ф. 880, воп. 1, спр 10, арк. 124.

[10] J. Garbiński, J. Turonek, *Białoruski ruch chrześcijański XX wieku. Słownik biograficzno-bibliograficzny*, Warszawa 2003, s. LIII.

[11] Ю. Туронак, *Да гісторыі Друйскага Марыянскага манастыра*, [у:] Ю. Туронак, *Мадэрная гісторыя Беларусі*, Вільня 2006, с. 397.

ны і Гродзеншчыны, за што атрымлівалі ад яе матэрыяльную дапамогу. На гэтыя грошы спачатку і выдавалася газета «Крыніца»”[12].

Такім чынам найбольш папулярнымі сёння з’яўляюцца версіі аб тым, што БХД фінансавалася найперш за кошт даходаў ад гаспадарчай дзейнасці марыянаў у Друі і грашовых сродкаў, што паступалі з Літвы.

На нашу думку абсалютызаваць фінансавыя магчымасці кляштара ў Друі не варта. Па-першае: далёка не ўсе ахвяраваныя М. Радзівіл сродкі сапраўды пайшлі на беларускую справу. Напрыклад, грошы, атрыманыя за брыльянтавае калье, падараванае беларускім святарам Магдалінай Радзівіл, кс. Фабіян Абрантовіч часткова пазычыў біскупу Зыгмунту Лазінскаму на будаўніцтва ў Пінску духоўнай семінарыі, а на рэшту купіў два дамы ў Навагрудку[13]. Па-другое: на працягу 1930-х гг. суперыёр друйскага манастыра Андрэй Цікота меў даволі напружаныя стасункі з тагачаснымі ідэолагамі БХД (у прыватнасці, з кс. А. Станкевічам), якіх вінаваціў у палітыканстве і стараўся неяк адмежаваць сваіх гадунцоў (напрыклад, вучняў марыянскага дому ў Вільні) ад уплываў хадэкаў[14]. Па-трэцяе і друйскі кляштар часцей за ўсё сам знаходзіўся не ў найлепшым фінансавым становішчы. У 1935 г. ксёндз Язэп Германовіч, які ў гэты час знаходзіўся ў Харбіне, атрымаў у спадчыну дом у Пружанах. Ксёндз прадаў дом нейкаму Ройку, а атрыманыя 2 300 долараў перадаў кс. А. Станкевічу. Кс.Германовіч наказваў Станкевічу пакінуць з гэтай сумы 1 500 долараў на перыядычныя выданні „Беларуская крыніца” і „Хрысціянская думка”, а 800 — перадаць у Друю, „бо і там бяда”[15]. Як бачым, беларускім ксяндзам самым даводзілася дапамагаць Друі.

Меркаванне аб падтрымцы БХД з боку Літвы пацвярджаецца фактамі, але патрабуе ўдакладнення. Безумоўна, на працягу ўсяго міжваеннага дваццацігоддзя лідэры БХД бачылі ў літоўскай рэспубліцы найбольш рэальнага саюзніка ў барацьбе за незалежнасць Беларусі, тым больш, што да пачатку 1927 г. у Коўне актыўна працаваў Вацлаў Ластоўскі, які, па ўсёй бачнасці, лічыў сваёй найбольш даверанай асобай у Заходняй Беларусі менавіта ксяндза Адама Станкевіча. У сваю чаргу гэтага ксяндза польская паліцыя характарызавала як „старога калегу і супрацоўніка Ластоўскага”[16]. Гэта не дзіўна, бо, па некаторых звест-

[12] І. І. Коўкель, *Беларуская хрысціянская дэмакратыя і яе роля ў беларускім грамадска-палітычным руху*, [у:] *Этносоциальные конфессиональные процессы в трансформирующемся обществе*, Гродно 2001, ч. 2, с. 40.

[13] А. Надсан, *Біскуп Чэслаў Сіповіч: сьвятар і беларус*, Менск 2004, с. 26-27.

[14] Там жа, с. 37.

[15] Беларускі дзяржаўны архіў-музей літаратуры і мастацтва (далей: БДАМЛіМ), ф. 3, воп. 1, спр. 279, арк. 15.

[16] CAW, Oddział II Sztabu Generalnego, sygn. I.303.4.2475.

ках, кс. А. Станкевіч займаў ва ўрадзе Беларускай Народнай Рэспублікі, створаным у канцы 1919 г. В. Ластоўскім, пасаду міністра рэлігійных спраў[17].

Найбольш верагодна, што літоўскія грошы траплялі да лідэраў БХД трыма асноўнымі шляхамі:

1) Па лініі ўрада БНР — праз В. Ластоўскага, які да свайго ад'езду ў Менск у пачатку 1927 г. перадаваў дзеячам Беларускага пасольскага клуба (БПК) у польскім Сейме пэўныя грашовыя сумы.

2) Праз літоўскія нацыянальныя арганізацыі ў Вільні для пакрыцця дэфіцытаў беларускай прэсы (у прыватнасці органа БХД „Крыніца"). Да гэтых захадаў меў дачыненне Беларускі нацыянальны цэнтр у Літве пад кіраўніцтвам В. Ластоўскага.

3) Непасрэдна ад літоўскіх нацыянальных дзеячаў і арганізацый Віленшчыны беларускім хрысціянскім дэмакратам.

Аднак у перыяд 1922 — першая палова 1925 гг. фінансавая сродкі літоўцы прызначалі на патрэбы ўсяго, яшчэ адзінага, беларускага руху. Грошы ішлі не непасрэдна ў касу БХД, а найперш для БПК, намеснікам якога быў адзін з лідэраў беларускіх хадэкаў кс. А. Станкевіч. Больш таго, як сведчыў В. Ластоўскі, „полностью литовцы не финансировали белорусской виленской прессы — издания Станкевича и Яремича, но только частично покрывали их дефицит. На совещаниях в Данциге обыкновенно стоял вопрос средств на прессу. Результат совещания я докладывал на заседании Центра[18]. Средства литовцы передавали, кажется, через свой комитет в Вильно"[19]. Вельмі падобныя звесткі знаходзім і ў польскіх афіцыйных матэрыялах аб беларускім руху: „Сродкі віленскай экспазітуры сеймавага клуба фарміруюцца з адлічэння 10% ад пасольскіх дыетаў, з даходаў Беларускага нацыянальнага камітэта і з-за мяжы (Ластоўскі). З гэтых сродкаў выдаюцца дзве газеты „Крыніца" і „Новае жыцьцё" [дадзеныя на люты 1923 г. — А. В.]"[20].

Як бачым на аснове вядомых сёння фактаў можна сцвердзіць, што падтрымка БХД з боку літоўскай рэспублікі была хутчэй спарадычнай, чым пастаяннай. Тым больш, што па звестках В. Ластоўскага, адносіны кс. А. Станкевіча з лідэрамі літоўскай хадэцыі былі даволі няроўныя і грунтоўна папсаваліся ўжо ў сярэдзіне 1920-х гадоў[21]. Нельга таксама забывацца і аб тым, што пачынаючы з 1923 года, калі Ліга Нацый прызнала Віленшчыну часткай Польшчы, увага літоўскіх правячых эліт

[17] *Krótki zarys zagadnienia białoruskiego*, Warszawa 1928, s. 95.

[18] Маецца на ўвазе Беларускі цэнтр у Літве.

[19] *Дополнительные показания Вацлава Ластовского от 31.VIII.1930 г.*, „Маладосць", 1993, № 8, с. 233.

[20] CAW, Oddział II Sztabu Generalnego, sygn. I.303.4.5230, k. 60.

[21] *Дополнительные показания Вацлава Ластосвкого...*, с. 212-213.

да беларускага пытання значна зменшылася.

Такім чынам грашовыя паступленні для беларускіх хадэкаў з Літвы і ад манахаў з Друі хаця і мелі месца, аднак не адыгрывалі вырашальнай ролі ў фарміраванні партыйнага бюджэту. Перш чым перайсці да разгляду звестак аб іншых крыніцах фінансавання БХД, звернем увагу на асноўныя артыкулы расходаў гэтай партыі.

БХД, у адрозненне, скажам, ад КПЗБ, не мела штату нелегальных платных функцыянераў. Большасць партыйных пасад, за выключэннем справавода, таксама пастаянна не аплачвалася. Па гэтай прычыне расходы на партыйную бюракратыю былі невялікія і абмяжоўваліся аплатай справавода і камандзіровачных расходаў. Амаль усе выдаткі партыі ішлі на прапаганду. Галоўным накірункам тут была, несумненна, выдавецкая справа.

Друкаванае слова было адным з галоўных сродкаў палітызацыі беларускіх мас. Партыйныя газеты, адозвы, лістоўкі і проста папулярная і адукацыйная літаратура на беларускай мове выдатна дапамагалі культурнай рабоце і пашырэнню нацыянальнай ідэі, але з другога боку патрабавалі вялікіх грашовых укладанняў, якіх беларускі рух ніколі не меў. Апроч чыста фінансавых праблем вельмі актуальным было і пытанне аб адсутнасці ў беларусаў у Польшчы сваёй друкарні. Менавіта таму стварэнне Беларускай друкарні імя Францішка Скарыны трэба прызнаць найбольш удалай у фінансавым сэнсе акцыяй дзеячаў, звязаных з Беларускай хрысціянскай дэмакратыяй. Ідэя стварэння друкарні па ўсёй бачнасці належыць Янку Станкевічу. Яшчэ летам 1925 г. у сваім лісце да В. Ластоўскага Я. Станкевіч пісаў: „У мяне ўзнялася гарачая думка, каб у сёлетнія ўгодкі Ф. Скарыны Крывічы купілі хоць невялікую друкарню, як аснову будучай вялікай. Пісаў я аб гэтым ксяндзу Адаму Станкевічу ў Вільню, але ён, адпісуючы, на гэта нічога не сказаў”[22].

Справай набыцця друкарні заняліся тры чалавекі: ксёндз Адам Станкевіч, Фабіян Ярэміч і суперыёр марыянскага кляштара ў Друі ксёндз Андрэй Цікота. Па звестках Язэпа Найдзюка фінансавы ўклад Цікоты быў самы значны, хаця, безумоўна, паслы Сейма кс. А. Станкевіч і Ф. Ярэміч таксама ахвяравалі частку сваіх пасольскіх грошай[23]. Магчыма, некаторыя сродкі былі атрыманыя і ад В. Ластоўскага. Ужо ў маі 1926 г. кс. А. Станкевіч і Ф. Ярэміч купілі частку друкарні „Lux” у Вільні і заснавалі Беларускую друкарню імя Ф. Скарыны.

[22] *Архівы БНР (Фонд № 582 Дзяржаўнага Архіву Літвы „Рада Міністраў Беларускай Народнай Рэспублікі”)*, Вільня — Нью-Ёрк — Менск — Прага 1998, т. I, кн. 2, с. 1616.

[23] Ю. Туронак, *Да гісторыі Друйскага Марыянскага манастыра*, с. 397.

Нягледзячы на тое, што валоданне друкарняй амаль не прыносіла прыбыткаў, яно дазволіла значна скараціць расходы на друкаванне літаратуры, газет і часопісаў, зрабіла выдавецтва больш самастойным і адносна бяспечным. Друкарня праіснавала да 1940 г. і адыграла важную ролю ў беларускім жыцці, толькі кнігаў за 15 гадоў было надрукавана не менш 146 (каля 40% ад агульнай колькасці ўсіх легальных беларускіх кніжак у міжваеннай Польшчы), выдавалася ўся хадэцкая перыёдыка. У друкарні выдаваліся партыйныя адозвы, бланкі дакументаў, абвесткі, а таксама значная частка выданняў іншых палітычных груповак. Як пісаў кіраўнік друкарні Я. Найдзюк, „усе беларускія друкі выконваюцца ў ёй па цане вельмі нізкай, каб толькі змагчы аплаціць работнікаў, а калі ходзіць аб справу грамадзкую, або чыста культурнага беларускага характару, то па магчымасьці і зусім дарма. Ад часу заснаваньня друкарні і аж па сёньняшні дзень уласьнікі ня толькі ня маюць зь яе ніякіх даходаў, але наадварот — дакладаюць з свае ўласнае кішані на пакрыцьцё непамерна вялікіх падаткаў скарбавых, якія ўлады скарбавыя вызначаюць паводле свайго разуменьня”[24].

Надрукаваныя кнігі па падпісцы рассылаліся гурткам БІГіКу і рэалізоўваліся праз кнігарні. Кнігі з друкарні карысталіся пэўнай папулярнасцю, аб чым сведчыць выданне заходнебеларускімі камуністамі сваіх кніг і брашур з прадстаўленым на іх аўтарствам кс. А. Станкевіча або Беларускай друкарняй імя Ф. Скарыны як месцам выдання[25]. Папулярнасць і аўтарытэт лідэраў БХД дазвалялі ім збіраць грошы на кнігі сярод беларускага грамадзянства, найперш інтэлігенцыі. Напрыклад, ахвяраванні на адзін беларускі малітоўнік збіраліся адразу ў банку[26] на асабісты рахунак кс. А. Станкевіча, а газета „Крыніца” ўжо ў сярэдзіне 1920-х гг. мела амаль 900 падпісчыкаў па ўсёй Беларусі[27]. Але фінансавыя праблемы і надалей патрабавалі пошуку магчымасцей для выдання больш танных беларускіх кніг. Кс. Германовіч аднойчы нават прапанаваў кс. Станкевічу выдаваць беларускія кніжкі ў кітайскім Харбіне[28].

З упэўненасцю можна сцвердзіць, што нягледзячы на ўсе цяжкасці, беларускія хадэкі сталі ў Заходняй Беларусі лідэрамі ў беларускай выдавецкай справе. Не апошнюю ролю тут адыграла і ўдалае ўкладанне фінансавых сродкаў.

Адной з важнейшых крыніц фінансавання БХД і залежных ад яе структур былі заробкі беларускіх паслоў польскага Сейма. Заробак пасла (гэтак званыя „пасольскія дыеты”) складаў да 600 $. Частка гэтых

[24] „Беларуская Крыніца”, 1932, № 23, с. 4.
[25] „Беларуская Крыніца”, 1930, № 25, с. 2.
[26] „Беларуская Крыніца”, 1934, № 9, с. 2.
[27] „Biełaruskaja Krynica”, 1925, № 5, s. 1-2.
[28] БДАМЛіМ, ф. 3, воп. 1, спр. 279, арк. 18.

грошай ішла ў касу БПК, частка ў партыйную касу. У перыяд 1925-1927 гг. БХД у Сейме прадстаўляў кс. А. Станкевіч, пасля выбараў 1928 года дзейнасць партыі фінансавалі паслы Сейма ад БХД Альбін Становіч і П. Каруза. Аб тым, наколькі залежалі беларускія хадэкі ад пасолькіх грошай сваіх дэпутатаў у Сейм, сведчаць гадавыя справаздачы Беларускага інстытута гаспадаркі і культуры. Калі ў 1929 г. БІГіК амаль штомесяц атрымоўваў ад Беларускага пасольскага клуба 600 злотых (з іх 200 зл. атрымоўваў справавод, 120 зл. — настаўніцы школ у Шаўлянах і Рудаўцы)[29], то ў 1931 г., калі БПК ужо не існавала, Урад БІГіКу за цэлы год патраціў усяго 1 620 зл. і меў у выніку больш 300 зл. дэфіцыту[30]. У 1935 годзе гадавы абарот Ураду БІГіКу склаў усяго 975,35 зл.[31] Няцяжка падлічыць, што фінансавыя паступленні ў 1931 годзе знізіліся адносна 1929 г. як мінімум у тры-чатыры разы, а ў 1935 г. — у шэсць разоў.

У існуючай сітуацыі не магло нават быць размовы аб значнай грашовай дапамозе партыйным арганізацыям па-за Вільняй. Мясцовыя гуркі і БХД, і БІГіКу павінны былі забяспечваць самыя сябе. У 1931 г. кс. В. Гадлеўскі пісаў да членаў аднаго з гурткоў БІГіКу: „Даўней было 4 паслоў і 2 сенатараў, тады яны складаліся на Інстытут, а цяпер і гэтага няма, дык Інстытут пакінуты самому сабе і ахвярнасьці прыватных людзей, якія таксама бедны. Цяпер Інстытут трымаецца таго правіла, што кожны гурток павінен быць самавыстарчальным г.зн. сам павінен здабываць спосабы для свайго існаваньня. Гэткімі спосабамі служаць тэатральныя пастаноўкі, але што-ж? І да іх часам трэба дакладаць. Але ці гэта мае значыць, што мы павінны кінуць усю культурную працу і чакаць толькі помачы? Не, ніхто нам не паможа, калі мы самі сабе не паможам"[32]. Фактычна, з-за адсутнасці сродкаў і рэпрэсій польскай адміністрацыі прыйшлося зачыніць прыватныя школы ў Рудаўцы і Шаўлянах, што ўтрымліваліся хадэкамі. Улады патрабавалі непамерных выплатаў за афармленне ўсёй школьнай дакументацыі, не хацелі выдаваць настаўніцам пасведчанняў аб маральнасці. Не было грошай на школу і ў БІГіКу. У ліпені 1931 г. кс. Гадлеўскаму прыйшлося поўнасцю выкласці ўсю касу Інстытута, каб хоць часткова выдаць настаўніцам заробкі[33].

Не менш значнай крыніцай фінансавання беларускіх хадэкаў былі складкі ксяндзоў-прыхільнікаў БХД. У лютым 1929 г. кс. Фабіян Абрантовіч, высылаючы кс. А. Станкевічу чэк на 100 долараў, пісаў: „Ста-

[29] НА РБ, ф. 880, воп. 1, спр. 4, арк. 4.
[30] Там жа, арк. 7.
[31] Там жа, арк. 11 адв.
[32] Там жа, спр. 10, арк. 275 адв.
[33] Там жа, спр. 10, арк. 10.

раюся, каб прыслаць Табе і Вінцуку [Гадлеўскаму — аўт.] доларавых інтэнцыяў (...). Думаю, што зара дастану і вышлю"[34]. На працягу ўсіх 1930-х гг. па 20-30 долараў прысылаў кс. А. Станкевічу кс. Янка Тарасевіч — манах манастыра св. Пракопа ў штаце Ілінойс у ЗША. Такіх фактаў у архіўных дакументах пералічваецца вельмі многа. Паводле гісторыка Ю. Туронка дапамогу Беларускай хрысціянскай дэмакратыі аказвала да пяцідзесяці каталіцкіх ксяндзоў, якія, часта афіцыйна не супрацоўнічалі з БХД, аднак спачувалі ёй[35]. Сумы, накшталт той, што была ў 1935 г. ахвяравана кс. Германовічам (2 300 долараў) былі рэдкія, аднак, гледзячы па ўсім, кс. А. Станкевічу і кс. В. Гадлеўскаму ўдалося арганізаваць сярод беларускіх ксяндзоў нешта накшталт касы ўзаемадапамогі. Дзясяткі ксяндзоў, беларусаў па паходжанні, што жылі ў Польшчы, ЗША, Кітаі, Італіі лічылі сваім абавязкам фінансава падтрымліваць БХД, ведаючы, што сродкі, перададзеныя Станкевічу і Гадлеўскаму, будуць патрачаны па прызначэнню. Вядома, што некаторыя ксяндзы перадавалі кс. А. Станкевічу частку сваіх імшальных стыпендыяў, якія з'яўляюцца адным з галоўных сродкаў існавання духоўнай асобы. Так яшчэ вясной 1923 г. кс. Ільдэфонс Бобіч пісаў, што пакінуў 15 долараў стыпендыяў сабе, а 25 перадаў кс. А. Станкевічу для аказання дапамогі ксяндзам Канстанціну Стаповічу і Міхаілу Пятроўскаму, якія трапілі пад рэпрэсіі польскіх улад[36].

На жаль, падобная фінансавая „падпітка" з боку свецкага беларускага грамадзянства была вельмі слабой, у першую чаргу з-за нязначнасці нацыянальна свядомага сярэдняга класа на вёсцы і поўнай адсутнасці беларускай нацыянальнай буржуазіі ў горадзе. Да ўсяго дадавалася таксама і незаможнасць беларускай вёскі. Ахвяраванне значных сум на дзейнасць БІГіКу і БХД было хутчэй адзінкавае, чым заканамернае. Так у 1933 г. адзін жыхар Мядзведзіцкай гміны Баранавіцкага павета ахвяраваў БІГіКу 100 долараў, гэтыя грошы сталі асновай для пабудовы ў 1936 г. беларускага дома[37]. Больш заможнымі і, гледзячы па ўсім, свядомымі былі беларусы замежжа. Яшчэ ў 1923 г. адзін з лідэраў беларускай эміграцыі ў ЗША Янка Чарапук перасылаў кс. А. Станкевічу пэўную суму грошай, дапамагаў Беларускаму студэнцкаму саюзу[38].

Некалькі разоў беларускія хадэкі спрабавалі арганізаваць эканамічную дзейнасць, якая б прыносіла прыбыткі. Уласна і Беларускі інсты-

[34] Аддзел рукапісаў бібліятэкі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі (далей: АР НАНБ), ф. 4, воп.1, спр. 138, арк. 10адв.

[35] J. Garbiński, J. Turonek, *Bałoruski ruch chrześcijański XX wieku...*, s. LXXVIII.

[36] АР НАНБ, ф. 23, воп. 1, спр. 792, арк. 5.

[37] M. Moroz, *„Krynica". Ideologia i przywódcy białoruskieqo katolicyzmu*, Białystok 2001, s. 196.

[38] НА РБ, ф. 884, воп. 1, спр. 1, арк. 17адв.

тут гаспадаркі і культуры ствараўся не толькі як культурна-асветніцкая, але і як гаспадарчая і эканамічная арганізацыя. У 1926-1927 гг. працавалі кааператыўна-гандлёвыя курсы БІГіКу (іх наведвала больш 30 чалавек), на якіх выкладаліся асновы эканомікі і кааперацыі, бухгалтэрыя, справаводства, беларускамоўная карэспандэнцыя і інш. Аднак стварыць сістэму прыбытковага беларускага прадпрымальніцтва хадэкам так і не ўдалося. Напрыклад, у 1927 г. старшыня БІГіКу Адам Більдзюкевіч набыў рэйсавы аўтобус і паспрабаваў адкрыць адзін з першых на Віленшчыне аўтобусных маршрутаў, але з-за вялікіх коштаў білетаў функцыянаванне маршрута было нерэнтабельным, а аўтобус хутка зламаўся[39].

Няшмат палепшыў эканамічнае становішча створаны восенню 1927 г. хадэцкім асяроддзем Беларускі кааператыўна-прамыслова-земляробскі банк[40]. Функцыі апошняга звяліся да акумулявання грашовых сродкаў некаторых беларускіх кааператываў і прызначэння стыпендыяў і аднаразовых крэдытаў найбольш незаможным і здольным членам Беларускага студэнцкага саюза[41].

Збіраць грошы на беларускую справу сярод сваіх парафіян, не будучых членамі БІГіКу ці БХД, беларускія ксяндзы як правіла не рашаліся, паколькі гэта выклікала імгненную жорсткую рэакцыю з боку касцельных і свецкіх улад. Арганізаваць падобную акцыю кс. А. Станкевіч прапанаваў толькі аднойчы, летам 1929 г., калі беларуская друкарня імя Ф. Скарыны магла быць зачынена з-за даўгоў[42]. У матэрыялах дэфензівы ёсць таксама звесткі аб тым, што ў 1923 г. кс. В. Гадлеўскі абклаў парафіян касцёла ў Жодзішках падаткам на беларускія арганізацыі па 300 марак з асобы, але апошняе выглядае малаверагодным, бо, паводле таго ж паведамлення, ксёндз плаціў аж па 5 000 марак кожнаму, хто галасаваў за беларускіх кандыдатаў на выбарах у Сейм[43].

Паколькі пасля 1926 г. віленская біскупская курыя не аказвала ніякай дапамогі хадэкам, беларускія ксяндзы нярэдка звярталіся да высокапастаўленых каталіцкіх святароў непалякаў. Яшчэ ў 1921 г. кс. Адам Станкевіч звяртаўся за дапамогай да чэхаславацкага біскупа сенатара А. Стаяна[44], у 1934 г. італьянскага біскупа Франчэска Мармагі наведаў кс. Язэп Рэшаць. І калі ў першым выпадку ў дапамозе беларускім хадэкам было адмоўлена, то ў другім удалося дасягнуць пэўнага поспеху. Мармагі, уражаны добрым веданнем кс. Я. Рэшацем італьянскай

[39] М. Казлоўскі, *Галасы разбуджаных птушак*, Мінск 2006, с. 178.
[40] Там жа, с. 177-178.
[41] НА РБ, ф. 880, воп. 1, спр. 6Б, арк. 78.
[42] Moroz M. *„Krynica". Ideologia i przywódcy...*, s. 177-178.
[43] AAN, MWRiOP 1917-1939, sygn. 927, k. 208-209.
[44] АР НАНБ, ф. 4, воп. 1, спр. 138, арк. 3.

мовы, абяцаў фінансаваць выданне некаторых рэлігійных кніг на беларускай мове аднак прызнаў, што мае звязаныя рукі, паколькі фактычна павінен пагаджацца з пазіцыяй польскага епіскапата адносна справы беларусізацыі Каталіцкага касцёла[45]. Найбольш шчыльнымі былі кантакты кс. А. Станкевіча з біскупам Гданьска Эдвардам О'Руркам, які стаяў на прынцыповых пазіцыях абароны інтарэсаў беларусаў перад Рымам, паколькі сам паходзіў з Навагрудчыны і некаторы час займаў высокую пасаду ў каталіцкай іерархіі ў Мінску. У сярэдзіне 1920-х гг. кс. А. Станкевіч наведваў О'Рурка ў Гданьску, але сказаць больш дакладна аб выніках іх сустрэч пакуль нельга[46]. Нельга таксама абмінуць справу ўзаемаадносін лідэраў БХД з украінскім грэка-каталіцкім мітрапалітам Андрэем Шаптыцкім. Шаптыцкі актыўна дапамагаў беларускаму нацыянальна-вызваленчаму руху і быў знаёмы з кс. Уладыславам Талочкам і кс. В. Гадлеўскім яшчэ з 1917 г. У пачатку 1920-х гг. кс. А. Станкевіч прывёз ад Шаптыцкага 1000 амерыканскіх долараў, якія былі ахвяраваны апошнім на пабудову дома для беларускага музея імя Івана Луцкевіча[47].

Мелі хадэкі таксама і кантакты не толькі з украінскімі рэлігійнымі дзеячамі, але і палітычнымі партыямі. Напрыклад, у адной са справаздач польскай паліцыі паведамлялася, што беларускія хадэкі, шукаючы сродкі да арганізацыі перадвыбарнай барацьбы ў 1930 г., заключылі пакт аб супрацоўніцтве з Украінскай нацыянальна-дэмакратычнай арганізацыяй (УНДА), аднак арышты сярод лідэраў апошняй перарвалі супрацоўніцтва[48].

Завяршаючы агляд крыніц фінансавання БХД, нельга пакінуць паза ўвагай яшчэ адзін важны сюжэт. Паводле шматлікіх сведчанняў кс. А. Станкевіч ніколі не цураўся фінансавых паступленняў ад радыкальных беларускіх арганізацый, асабліва калі гэта тычылася друку і не наносіла ідэалагічнай шкоды самім хадэкам. Гэта зразумела, паколькі і Беларуская сялянска-работніцкая грамада (БСРГ), і пасольскі клуб „Змаганне" і ўласна Камуністычная партыя Заходняй Беларусі пастаянна падмацоўваліся велізарнымі валютнымі сумамі з СССР[49], у сваю чаргу БХД ніякай значнай знешняй фінансавай падтрымкі не мела. У канцы 1926 г. друкарня імя Ф. Скарыны надрука-

[45] АР НАНБ, ф. 4, воп. 1, спр. 138, арк. 14.

[46] CAW, Oddział II Sztabu Generalnego, sygn. I.303.4.2696.

[47] „Беларуская Крыніца", 1933, № 21, с. 1.

[48] CAW, Oddział II Sztabu Generalnego, sygn. I.303.4.2706, k. 19-21.

[49] Так зацверджаны ў Мінску бюджэт КПЗБ на 1926/27 г. складаў 468 тыс. савецкіх рублёў, з іх 153 тыс. ішло на ўтрыманне ЦК КПЗБ (фактычна, партыйных функцыянераў) і 112 тыс. рублёў на дапамогу беларускім грамадскім арганізацыям: Т. С. Протько, *Становление советской тоталитарной системы в Беларуси (1917-1941 гг.)*, Минск 2002, с. 70-71.

вала другое выданне праграмы БСРГ[50], летам 1929 г. кс. А. Станкевіч па дамоўленасці з Ігнатам Дварчаніным выдаў у друкарні радыкальную газету „Сьвет”[51]. У другой палове 1930-х гг. КПЗБ падтрымлівала выданне часопіса „Калосьсе”, а ў друкарні імя Ф. Скарыны са згоды яе ўласніка кс. Станкевіча працавалі нелегальныя наборшчыкі-члены КПЗБ. Неабходна таксама звярнуць увагу на тое, што будучы выключаным амаль з усіх арганізацый, якія былі пад уплывам Грамады, Адам Станкевіч да самага канца заставаўся членам праўлення адной з самых важных грамадоўскіх інстытуцый — Беларускага кааператыўнага банка і нават штомесяц атрымоўваў 200 злотых[52] (кошт тыражу прыкладна аднаго нумара „Беларускай крыніцы”). З матэрыялаў польскай паліцыі вядома таксама, што на сустрэчы беларускіх дзеячаў 22 лістапада 1925 г. кс. А. Станкевіч атрымаў з рук пасла Ф. Ярэміча 1000 долараў на выданне „Беларускай крыніцы”. Грошы гэтыя, па словах Ярэміча, паходзілі з БССР і былі прызначаны непасрэдна для беларускіх хадэкаў[53].

Падобныя кантакты лідэраў БХД з прадстаўнікамі беларускіх радыкальных арганізацый левага накірунку сведчаць аб іх супольным здаровым імкненні (часта насуперак афіцыйнай пазіцыі Менска) да стварэння агульнабеларускага фронту ў барацьбе за правы беларускай нацыянальнай меншасці ў Польшчы. На жаль, вялікі патэнцыял гэтага супрацоўніцтва так ніколі і не быў рэалізаваны ў поўнай меры.

Такім чынам усе вышэйпералічаныя факты можна звесці да адной агульнай высновы, што ў фінансавых адносінах Беларуская хрысціянская дэмакратыя забяспечвалася галоўным чынам за кошт сваіх членаў і сімпатыкаў (спачуваўшых БХД ксяндзоў, паслоў-членаў БПК), а таксама ўласнай, напрыклад, выдавецкай, дзейнасці. Грашовыя паступленні ні ад Літвы, ні ад БССР, таксама як і ад каталіцкіх іерархаў і палітычных арганізацый іншых нацменшасцей, рашуча не ўплывалі на фінансавае становішча партыі. Грашовай падтрымкі з боку польскай адміністрацыі ў адмежак часу 1921-1939 гг. БХД не атрымлівала ніколі. Усё гэта з аднаго боку давала БХД магчымасць найбольш паслядоўна трымацца курсу, накіраванага на дасягненне незалежнасці Беларусі, з другога боку, бяручы пад увагу беднасць тагачаснага беларускага грамадства і нізкі ўзровень нацыянальнай свядомасці, не дазваляла беларускім хрысціянскім дэмакратам засяродзіць у сваіх руках значныя фінансавыя сродкі для вядзення больш шырокай і эфектыўнай палітычнай работы ў масах.

[50] А. Бергман, *Слова пра Браніслава Тарашкевіча*, Мінск 1996, с. 87.
[51] M. Moroz, *„Krynica”. Ideologia i przywódcy...*, s. 178.
[52] CAW, Oddział II Sztabu Generalnego, sygn. I.303.4.2696.
[53] Дзяржаўны архіў Брэсцкай вобласці, ф. 93, воп. 1, спр. 589, арк. 19.

Streszczenie

Sowieccy historycy białoruscy najwięcej uwagi spośród wszystkich białoruskich partii działających w II Rzeczypospolitej poświęcali KPZB. O Białoruskiej Chrześcijańskiej Demokracji kształtowali opinię, że była to partia związana z polską administracją i przez nią finansowana. BChD była organizacją najbardziej zdecydowanie opowiadającą się za niepodległością i zjednoczeniem Białorusi. Z tego powodu jednakowo zwalczała ją zarówno strona polska, jak i sowiecka. Według dokumentów polskiego kontrwywiadu BChD do wyborów parlamentarnych przystępowała mając zupełnie pustą kasę. Zdaniem niektórych historyków jednym ze źródeł finansowania partii, zwłaszcza wydawnictw, były płynące od kleru sympatyzującego z partią dochody uzyskane z gospodarki klasztoru Ojców Marianów w Drui. Inni wskazują na dotacje płynące ze strony rządu litewskiego. Fakty wskazują jednak, że pomoc z Drui była niemożliwa. Nie można natomiast wykluczyć pomocy finansowej ze strony Litwy, na przykład za pośrednictwem białoruskiego rządu emigracyjnego w Kownie. Okazjonalnie taka pomoc mogła napływać zwłaszcza w pierwszej połowie lat dwudziestych. Siła tej partii polegała głównie na ideowych przekonaniach i zaangażowaniu działaczy, którzy nie pobierali żadnych wynagrodzeń za pełnione funkcje. Działalność wydawnicza przynosiła pewne zyski i w dużym stopniu pokrywała także koszty organizacyjne. Jednym ze źródeł finansowania partii było także przekazywanie dochodów na jej rzecz przez posłów związanych z chadecją oraz białoruskich duchownych katolickich rozsianych po całym świecie. Mniejszą rolę odgrywały sumy przekazywane przez świeckich emigrantów białoruskich. Prawdopodobnie ksiądz Stankiewicz uzyskiwał także okazjonalnie jakąś pomoc finansową na cele wydawnicze od unickiego metropolity Andrzeja Szeptyckiego, biskupa gdańskiego Edwarda O'Rourke'a oraz lewicowych działaczy białoruskich wspieranych z Białorusi Radzieckiej.